## НАША ДЭЛЕГАЦЫЯ Ў КІТАІ

З 20-га кастрычніка дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе рэктара члена-карэспандэнта АН Рэспублікі Беларусь Л. А. Шамяткова, першага прарэктара кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта М. В. Селькіна, прарэктара па завочнаму навучанню кандыдата філалагічных навук М. М. Воінава, дэкана матэматычнага факультэта кандыдата тэхнічных навук, дацэнта У. В. Арлова і дэкана фізічнага факультэта кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта І. В. Семчанкі знаходзяцца ў сталіцы Кітайскай Народнай Рэспублікі — Пекіне. Нагадаем, што ў канцы мінулага навучальнага года Гомельшчыну і, у прыватнасці, ГДУ наведалі кіруючыя работнікі вышэйшай школы з Пекіна. Паездка нашых вучоных ва ўсходнюю суседнюю краіну з'явілася адказным візітам. Амаль за два тыдні знаходжання ў Кітаі яны змогуць пазнаёміцца з дасягненнямі ў развіцці кітайскай народнай адукацыі і, перш за ўсё, вышэйшай школы, наведаюць шэраг ВНУ Пекіна, зробяць шмат цікавых захапляльных экскурсій.

Гэты візіт стане новым крокам у пашырэнні і паглыбленні супрацоўніцтва паміж вучонымі Гомеля і КНР.


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 27 (814) | Аўторак, 22 кастрычніка 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

17 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта. Першым на парадку дня стаяла пытанне «Аб выніках уступных экзаменаў і задачы па арганізацыі новага набору і правядзенню ўступных экзаменаў у 1992 г.». З дакладам выступіла адказны сакратар прыёмнай камісіі дацэнт Т. В. Карпей. Прыняты некаторыя змяненні па ўступных экзаменах, аб чым падрабязна будзе расказана ў адным з нумароў нашай газеты.

Начальнік вучэбнага аддзела Н. І. Палкова праінфармавала Вучоны савет аб выніках прадметных універсітэцкіх і рэспубліканскіх студэнцкіх алімпіяд.

На вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Рашэннем Вучонага савета скасавана кафедра грамадзянскай абароны і медпадрыхтоўкі. Яе выкладчыкі пераведзены на кафедру лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.

Вучоны савет разгледзеў таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

*Інтэрнат — твой дом*

## КАНТРОЛЬ УЗМАЦНЯЕЦЦА

У АПОШНІ час надзвычай востра паўстала пытанне аб пражыванні студэнтаў у інтэрнатах нашага універсітэта. Пачасціліся выпадкі крадзяжоў, псавання абсталявання, інвентару, грубага парушэння правілаў пражывання. Выяўлена таксама шмат выпадкаў, калі студэнты закончылі вучобу, але ўсё роўна працягвалі жыць у інтэрнаце. Усё гэта значыць, што строгага кантролю ў гэтай справе не было. І вось на адным з пасяджэнняў Вучонага савета універсітэта было прынята рашэнне: «З прычыны становішча ў інтэрнатах ГДУ, якое ўскладнілася, павелічэння ў іх выпадкаў процiпраўных дзеянняў і антысацыяльных паводзін студэнтаў стварыць пры рэктараце ГДУ аддзел інтэрнатаў, у функцыі якога ўключыць: засяленне і высяленне з інтэрнатаў; арганізацыю культурна-масавай і спартыўнай работы; кантроль за захаваннем правілаў і норм пражывання ў інтэрнатах».

Узначаліў аддзел па рабоце ў інтэрнатах Вячаслаў Гапееў, які раней працаваў у камітэце камсамола універсітэта. З ім гутарыць карэспандэнт нашай газеты:

**— Вячаслаў, як вядома, цяпер сур'ёзную ўвагу на інтэрнаты ВНУ звярнула Міністэрства народнай адукацыі нашай рэспублікі. Што канкрэтна прапанавана ім для паляпшэння работы ў іх, прадухілення розных негатыўных з'яў?**

— Былым міністрам народнай адукацыі нашай рэспублікі М. І. Дземчуком прапанавана ўнесці змены ў Жыллёвы кодэкс аб прадастаўленні навучальным установам права высялення студэнтаў за сістэматычнае парушэнне правілаў пражывання ў інтэрнатах. 31 верасня г.г. прынята пастанова, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «Высяленне з інтэрнатаў за сістэматычнае парушэнне правілаў унутранага распарадку, калі меры папярэджання не далі вынікаў, не супярэчыць закону і дапускаецца па аналогіі з пунктам 115», «Высяленне праводзіцца без права выдачы грамадзяніну іншага жыллёвага памяшкання», «Пры адмове студэнтаў пакінуць інтэрнат кіраўнік навучальнай установы мае права звярнуцца ў народны суд з іскам аб высяленні іх з інтэрната».

**— Што канкрэтна для паляпшэння ўсёй работы ў інтэрнатах робіцца аддзелам, які ты ўзначальваеш, у нашым універсітэце?**

— На дадзены момант аддзелам распрацавана новае палажэнне аб інтэрнатах ГДУ імя Ф. Скарыны. Плануецца набыць для кожнага інтэрната радыёапаратуру, устанавіць ігравыя аўтаматы, адкрыць відэакафэ, якое будзе працаваць па вечарах. Для гэтага эксперыменту мы вырашылі ўзяць інтэрнат № 1 па вул. Савецкай, 83а. А што з гэтага атрымаецца далей, будзе залежыць не толькі ад нас, але і ад самiх студэнтаў.

**— Як праходзіла засяленне ў інтэрнаты ГДУ сёлета? Жадаючых жа было шмат, каму вы аддавалі перавагу?**

— У гэтым навучальным годзе ў сувязі з вялікай колькасцю студэнтаў, якія маюць патрэбу ў інтэрнаце, пры залічэнні мы звярталі ўвагу перш за ўсё на іх матэрыяльнае становішча. Перавага аддавалася студэнтам са шматдзетных сем'яў, а таксама тым юнакам і дзяўчатам, якія не маюць аднаго з бацькоў. З 334-х заяў 247 было задаволена. Астатнія студэнты пакуль вымушаны пражываць на прыватных кватэрах. Штомесячна ім выплачваецца па 25 рублёў.

**(З асноўнымі патрабаваннямі палажэння аб студэнцкім інтэрнаце ГДУ імя Ф. Скарыны знаёмцеся на 4-й стар. нашай газеты).**

# А ЯК БЫ НАМ ЗНАЙСЦІ РЭЗЕРВЫ?

## АБО РАЗМОВА АБ ТЫМ, ШТО НАС ЦІКАВІЦЬ І ХВАЛЮЕ

Сёння нікому не патрэбна даказваць, як імклівa пры ўсё ўзрастаючым дэфіцыце і павышэнні цэн даражае наша жыццё. Усё большая колькасць працоўных, не кажучы ўжо пра пенсіянераў і іншых малазабяспечаных людзей, апынаюцца за рысай беднасці, калі не галечы. І хаця, магчыма, нам яшчэ не пагражае голад, аднак цэны нават на такія самыя неабходныя харчы, як бульба, капуста, іншыя дары палёў і агародаў, ужо цяпер становяцца не ўсім па кішэні. Іх кошт на рынку ў параўнанні з леташнім павялічыўся ў 5—10, а то і больш разоў.

А што ж чакае нас вясной? Ва ўсякім выпадку на аптымістычны лад настройвацца цяжка, бо перспектыў на лепшае пакуль што, на нашу асабістую думку, не прадбачыцца.

Дзе ж выйсце са складанага становішча? Вельмі многія разлічваюць на павышэнне заработнай платы. Магчыма, гэта і не самы рэальны і апраўданы шлях. Але лепш мець хоць «драўляныя» рублі, чым заставацца без капейкі за душой. Таму ўсё менш мы перастаем здзіўляцца і па-добраму зайздросціць, калі чытаем у друку або слухаем па радыё ці тэлебачанні паведамленні аб прыёме на працу розных спецыялістаў, іншы раз і не вельмі высокай кваліфікацыі, якім абяцаюць заробак у межах 700—1000 рублёў і нават вышэй.

Вось тут так і хочацца правесці паралель: а што ж маюць выкладчыкі і навукоўцы нашага універсітэта, не закранаючы ўжо іншыя катэгорыі работнікаў? Нагадаем: з красавіка сёлетняга года, пасля ўвядзення новых павышаных цэн на прадукты і тавары, стаўкі выкладчыкаў ГДУ з уведзенымі даплатамі склалі для асістэнта (без ступені) — 380, са ступенню — 430, старшага выкладчыка (без ступені) — 490, са ступенню — 540, дацэнта (кандыдата навук), які мае гэта званне — 630 руб. Прафесар (доктар навук) атрымоўвае цяпер 880 руб., прафесар, які не мае вучонай ступені доктара навук, —810 руб. У загадчыка кафедры з вучонай ступенню доктара навук і званнем прафесара месячная стаўка з даплатай 930 руб., а ў загадчыка кафедры, прафесара без ступені доктара навук — 880 руб. Калі ж узяць сярэдні заработак супрацоўнікаў вышэйшай школы, дык ён прыкметна ніжэйшы, чым у кваліфікаваных рабочых і нават у многіх выкладчыкаў сярэднеадукацыйных школ, педвучылішчаў і г. д. І гэта пры значным адтоку некаторых лепшых кадраў ВНУ ў больш бяспечныя па экалагічных умовах вобласці рэспублікі і рэгіёны краіны.

Як жа выправіць становішча? Аб гэтым вялася размова і на савеце рэктараў Гомельшчыны, і па іх хадайніцтву ў іншых вышэйстаячых інстанцыях.

Што ж змянілася ў становішчы бок? Некалькімі словамі не адкажаш. Па-першае, з пяці ВНУ Гомеля адзін — нядаўна створаны медыцынскі інстытут адносіцца да Міністэрства аховы здароўя Беларусі, БІІЧТ — да Міністэрства шляхоў зносін СССР, кааператыўны — да сістэмы «Белспажыўсаюза» і толькі два — наш універсітэт і політэхнічны інстытут — падпарадкаваны Міністэрству народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Апошнія дзве ВНУ, як кажуць, падпарадкоўваюцца аднаму «бацьку» і знаходзяцца ў аднолькавых умовах. А вось, як ні дзіўна, аплата тут далёка не аднолькавая. Напрыклад, у ГПІ многія дацэнты атрымоўваюць у месяц да 1125 рублёў, а прафесары — яшчэ больш.

З чаго ж складваецца такі заработак? На гэта пытанне, якое задавалі нам некаторыя чытачы нашай газеты, мы папрасілі адказаць рэктара Гомельскага політэхнічнага інстытута прафесара А. С. Шагіняна.

— **У прыватнасці**, да асноўных ставак, уведзеных сёлета па ўсёй краіне, мы ўвялі 50%-ю надбаўку за тое, што нашы выкладчыкі працуюць у Гомелі ў не зусім спрыяльных умовах пасля аварыі ў Чарнобылі. Яшчэ 25%-я надбаўка ўведзена для тых, хто мае 10-гадовы стаж навукова-педагагічнай работы. Акрамя гэтага распрацаваным палажэннем уведзена 50%-я надбаўка да асноўнай стаўкі для найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў, тых, хто актыўна займаецца навуковай і грамадскай дзейнасцю, выконвае метадычныя і іншыя распрацоўкі. Словам, гэтая надбаўка з'яўляецца своеасаблівым стымулам. 25% яго знаходзіцца ў распараджэнні самой кафедры і столькі ж — дэканата. Гэтая надбаўка назначаецца на кожны квартал. Яна актывізуе і дысцыплінуе людзей. Пры пэўных прычынах яе можна і пазбавіцца.

Вось калі падсумаваць асноўны аклад і прадугледжаныя надбаўкі, дык для нашага дацэнта з 10-гадовым стажам працы сённяшні месячны заработак і складае 1125 руб. Аднак мы не лічым, што гэтага ўжо дастаткова. Будзем дамагацца, каб стаўка дацэнта, як і іншых членаў прафесарска-выкладчыцкага саставу, улічваючы ўмовы нашай працы пасля чарнобыльскай трагедыі, павялічылася ўдвая.

**— Адкуль жа вы знаходзіце на ўсе гэтыя надбаўкі сродкі?**

— Выкарыстоўваем свае ўнутраныя магчымасці.

**— А ці не атрымаецца так, што ў ваш інстытут цяпер будуць прасіцца на работу вучоныя і выкладчыкі з іншых ВНУ горада?**

— Кадры пераманьваць не станем, бо ў цэлым наш інстытут імі ўкамплектаваны.

У тэлефоннай гутарцы мы не сталі высняць у А. С. Шагіняна вытокі іх рэзерваў для павышэння заработнай платы сваім работнікам. Няхай застаецца гэта іх «тайнай». Але хацелася б, каб такія рэзервы шукалі і знаходзілі і ў нашым універсітэце.

Б. ВАЛОДЗІН.

